# ПЛАН-КАНСПЕКТ УРОКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў VI КЛАСЕ ПА ТЭМЕ «УТВАРЭННЕ І ПРАВАПІС СКЛАДАНЫХ ПРЫМЕТНІКАЎ»

*Атрахімовіч Мікалай Алегавіч*

**Мэта:** актуалізаваць тэарэтычныя веды вучняў пра асаблівасці ўтварэння складаных прыметнікаў, азнаёміць з правіламі ўтварэння і правапісу складаных прыметнікаў.

**Задачы:**

дапамагчы вучням усвядоміць правапіс складаных прыметнікаў разам і праз злучок;

сфарміраваць уменне адрозніваць складаныя прыметнікі ад простых, правільна пісаць складаныя прыметнікі, разумець алгарытм дзеяння пры выбары правільнага напісання складаных прыметнікаў, выкарыстоўваць іх у вуснай і пісьмовай мове (моўная кампетэнцыя);

удасканальваць навыкі групавой працы, уменне вызначыць мэту сваёй дзейнасці і паказаць яе вынік (камунікатыўная кампетэнцыя);

стварыць умовы для выхавання добразычлівых адносін да людзей, паважлівага стаўлення да нацыянальнай культуры; для развіцця здольнасці да самаарганізацыі і павышэння матывацыі шляхам ажыццяўлення сумеснага мэтавызначэння і рэфлексіі; развіваць навыкі самакантролю, самаацэнкі (сацыяльная кампетэнцыя).

**Мэта на мове вучняў**[1]:

змагу адрозніць складаны прыметнік ад простага,

змагу патлумачыць умовы, пры якіх складаныя прыметнікі пішуцца праз злучок і разам,

змагу ўтварыць складаныя прыметнікі і правільна іх запісаць.

**Зваротная сувязь з вучнямі** арганізуецца з дапамогай прыёма «Святлафор» пасля выканання кожнага практыкавання.

**Тып урока:** урок засваення новых ведаў.

**Вучэбна-метадычнае забеспячэнне:** вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай і беларускай мовамі навучання пад рэдакцыяй Валочка Г.М. (2020), «Рабочы сшытак па беларускай мове. 6 клас» (склад. Г.В.Тумаш), карткі з дадатковымі заданнямі.

**Эпіграф:** Вучань, які вучыцца без жадання, — бяскрылая птушка (старажытнагрэчаскі філосаф Саазі).

Усе **дадаткі** размешчаны па спасылцы, прадстаўленай QR-кодам.

### Ход урока

**I. Арганізацыйны момант**[2].

З якім настроем вы прыйшлі на ўрок? Пажадайце паспяховай працы свайму суседу. Ведайце, што ўсё ў вас атрымаецца.

**II. Праверка дамашняга задання (пр. 327)**[3].

Вучні мяняюцца сшыткамі і адбываецца ўзаемаправерка практыкавання па прапанаваным шаблоне. (*Малюнак 1*).

Правапіс суфікса -ск-: снежаньскі, выдавецкі, восеньскі, баранавіцкі, юнацкі.

Правапіс -нн- у прыметніках: задуменны, здаравенны, вогненны.

Правапіс суфіксаў -аньк-, -еньк-, эньк-: чысценькі, вузенькі, светленькі.

Звяртаем увагу на правапіс мяккага знака ў прыметніках з суфіскам -ск-.

Малюнак 1

**III. Арыенціровачна-матывацыйны этап**[4].

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на эпіграф, просіць знайсці ў ім прыметнікі, растлумачыць розніцу ў іх утварэнні. Пасля вучні тлумачаць сэнс выказвання філосафа.

Настаўнік прапануе ім новы сказ:

*Сотні вастракрылых серабрыста-белых птушак над бронзава-залатым люстрам акіяна.* (Дадатак 1).

Вучні спрабуюць растлумачыць неаднолькавае напісанне прыметнікаў.

Вызначаюць мэту і задачы ўрока.

Фармулююць мэту асабістай вучэбнай дзейнасці (мэты на мове вучняў запісваюцца на дошку).

**IV. Аперацыйна-пазнаваўчы этап**[5].

Вучні выпісваюць усе прыметнікі са сказа і эпіграфа і адказваюць на пытанні:

1. Які прыметнік будзе «лішнім» у радзе выпісаных?
2. Чым ён адрозніваецца ад іншых прыметнікаў?
3. Чаму прыметнікі, што засталіся, з'яўляюцца складанымі?
4. Ці аднолькава напісаны гэтыя прыметнікі?
5. Чаму прыметнікі напісаны неаднолькава?

Пасля знаёмцтва з тэарэтычным матэрыялам у падручніку (с.164-165), складаюць разам з настаўнікам алгарытм разважання пра напісанне складаных прыметнікаў. (Дадатак 2).

**Фізкультхвілінка** праводзіцца ў форме гульні "Словаўтваральнае даміно". Настаўнік рыхтуе карткі па колькасці вучняў. Вучні шукаюць пару, утвараюць складанае слова, тлумачаць яго правапіс.

1. Блакітныя вочы. 2. Пяць павярхаў. 3. Шырокія

[1]Адпаведна методыкі актыўнай ацэнкі.

[2]Задача — стварыць добразычлівую рабочую атмасферу; наладзіць кантакт з вучнёўскай аўдыторыяй.

[3]Задача — пракантраляваць выкананне пісьмовага практыкавання, каб высветліць ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу, прааналізаць цяжкасці і запоўніць прабелы.

[4]Задача — арганізаваць уваходную дыягностыку і паўтарэнне апорных ведаў.

[5]Задача — азнаёміць з новым вучэбным матэрыялам, арганізаваць мэтанакіраваную пазнаваўчую дзейнасць вучняў, іх трэніроўку ў тых дзеяннях, авалодванне якімі з'яўляецца мэтай урока.

плечы. 4. Новы год. 5. Кіслы і салодкі яблык. 6. Палац шахмат і шашак. 7. Дэпо для рамонту вагонаў і г.д.

**Праверка разумення вывучанага** ладзіцца ў групах.

1 група выконвае пр. 336 (с. 166), 2 група — пр. 94 (2 ч. вучэбнага дапаможніка) у рабочым сшытку.

Кантроль за выкананнем заданняў арганізуецца праз узаемаправерку.

**Замацаванне вывучанага.**

1. Гульня «Паўслова за табою»: першую частку складанага прыметніка называе настаўнік, а вучні павінны хутка яго закончыць і правільна запісаць. Напрыклад, *светла-, бела-, беларуска-, паўночна-, дзесяці-* і інш. (Адказ: светлагаловы, белакрылы, беларуска-нямецкі, паўночна-заходні, дзесяціпавярховы).

2. Індывідуальная работа (для 4-х вучняў) па выкананні заданняў на картках. (Дадатак 3).

3. Праца па развіцці маўлення. Франтальная работа з класам па змесце тэксту «Быў пачатак чэрвеня». (Дадатак 4).

4. Гульня «Каляровая вясёлка»[6]. (Дадатак 5).

**V. Кантрольна-ацэначны этап.**

Задача: стварыць умовы для самакантролю, карэкцыі і самаацэнкі ведаў, уменняў і дзейнасці вучняў.

Вучні выконваюць **праверачны тэст.** (Дадатак 6).

**VI. Дамашняе заданне[7].**

1. §54, пр. 337 (выконваюць умову практыкавання).

2. Пр. 96 у рабочым сшытку.

3. Самастойная праца з тэкстам апавядання І.Пташнікава «Алені» (с. 237−244): выпісаць сказы са складанымі прыметнікамі (не менш за 6 прыметнікаў), пазначыць спосаб утварэння запісаных прыметнікаў.

**VII. Рэфлексія[8].**

Вучні адказваюць на пытанні:

1. Якія мэты вы ставілі перад сабой на пачатку ўрока?

2. Ці дасягнулі пастаўленых мэт?

3. Што дапамагло вам засвоіць новы матэрыял?

4. Што і для чаго рабілі на ўроку?

5. Над чым трэба яшчэ папрацаваць, каб кожны з вас змог правільна напісаць складаны прыметнік?

Настаўнік ацэньвае дзейнасць вучняў і выстаўляе адзнакі за вынікі іх вучэбных дасягненняў, улічваючы балы за праверачны тэст, выкананне дамашняга задання, колькасць і паўнату вусных адказаў.

*Дата поступления в редакцию: 10.02.2022*

# ПЛАН-КОНСПЕКТ УЧЕБНОГО ЗАНЯТИЯ ПО ПРЕДМЕТУ «РУССКИЙ ЯЗЫК» В III КЛАССЕ ПО ТЕМЕ «СОСТАВ СЛОВА»

*Буевич Светлана Григорьевна*

**Цель:** систематизировать и обобщить знания и умения по теме «Состав слова», совершенствовать навык разбора слова по составу.

**Задачи:**

содействовать развитию умений применять полученные знания в стандартной и нестандартной ситуации;

обеспечить условия для овладения учащимися алгоритмом разбора слова по составу и определения понятий: состав слова, приставка, корень, суффикс, окончание, основа, родственные слова;

обеспечить условия для развития орфографической зоркости, внимания;

способствовать воспитанию уважения к малой родине, окружающим людям.

**Тип урока:** обобщение и систематизация знаний о составе слова.

**Оборудование:** карточки с дифференцированным заданием; карточки с творческим заданием; кроссворд для работы со словарными словами; учебник, компьютер, мультимедийная презентация.

**Ход учебного занятия**

**I. Организационный этап.**

*На уроке будь старательным*
*Будь спокойным и внимательным.*
*Все пиши, не отставая,*
*Слушай, не перебивая.*
*Говорите четко, внятно,*
*Чтобы было все понятно.*
*Если друг стал отвечать,*
*Не спеши перебивать.*

С чего мы начинаем урок русского языка? *(С минутки чистописания)*

Ребята, догадайтесь, какую букву мы будем сегодня прописывать на минутке чистописания. Эта буква обозначает согласный звук, шипящий, всегда твердый, в словах может чередоваться со звуком [ш]. Правильно, это буква **ж**.

Посмотрите на доску. Зимний январский ветер надул в лесу большие сугробы, и, чтобы нам двигаться вперёд, мы должны эти сугробы преодолеть. (*Рисунок 1*).

[6]Праводзіцца пры дастатковай колькасці часу.
[7]Задача — забяспечыць самавызначэнне вучняў на дамашняе заданне.
[8]Задача — стварыць умовы для ацэнкі значнасці атрыманых ведаў і ўменняў выкарыстання ў далейшай дзейнасці.